УДК 331.45

В.М. Босак, праф., д-р с.-г. навук;
А.У. Дамнянкова, дац., канд. с.-г. навук;
І.Ц. Ярмак, дац., канд. біял. навук;
С.У. Кісялёў, дац., канд. тэхн. навук (БДТУ, г. Мінск)

# ЗАБЕСПЯЧЭННЕ АХОВЫ ПРАЦЫ Ў ЛЯСНОЙ ГАСПАДАРЦЫ

Лясная гаспадарка з'яўляецца своеасаблівай галіной эканомікі, якая характарызуецца шэрагам спецыфічных асаблівасцей: сезоннасць значнай часткі вытворчых працэсаў, працяглая праца на адкрытым паветры, вялікая колькасць тэхналагічных аперацый, праца з living рознабаковай тэхнікай і абсталяваннем і г. д. Усё гэта патрабуе асаблівых стасункаў па забеспячэнню бяспекі жыццядзейнасці і аховы працы, прадухіленню вытворчага траўматызму і прафесійных захворванняў [1–18].

Асноўным дакументам, які ўтрымлівае патрабаванні да аховы працы ў лясной гаспадарцы, з'яўляюцца Правілы па ахове працы пры вядзенні лясной гаспадаркі, апрацоўцы драўніны і вытворчасці вырабаў з дрэва: пастанова Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь і Міністэрства лясной гаспадаркі Рэспублікі Беларусь ад 30.03.2020 № 32/5.

Правілы вызначаюць патрабаванні па ахове працы пры выкананні высечкі дрэваў, лесагаспадарчых, лесаўпарадкавальных, лесанарыхтоўчых работ, ажыццяўленні лесакарыстання, работ па складзіраванню, пагрузцы, разгрузцы лесаматэрыялаў і піламатэрыялаў, а таксама работ, якія звязаны з апрацоўкай драўніны і вытворчасцю вырабаў з дрэва. Патрабаванні па ахове працы, якія ўтрымліваюцца ў дадзеным дакуменце, накіраваны на забеспячэнне здаровых і бяспечных умоў працы работнікаў, якія заняты выкананнем работ, якія звязаны з вядзеннем лясной гаспадаркі, апрацоўкай драўніны і вытворчасцю вырабаў з дрэва, і распаўсюджваюцца на ўсіх работадаўцаў незалежна ад іх арганізацыйна-прававых форм і форм уласнасці, калі яны працуюць у адпаведнай галіне.

Правілы ўтрымліваць 3 разделы і складаюцца з 31 главы і 2 дадаткаў.

Раздзел I “Агульныя палажэнні”:

– глава 1 “Агульныя патрабаванні”;

– глава 2 “Патрабаванні пры арганізацыі выканання работ, якія звязаны з вядзеннем лясной гаспадаркі, апрацоўкай драўніны і вытворчасцю вырабаў з дрэва”;

– глава 3 “Патрабаванні да ўчасткаў работ і працоўных месцаў”;

– глава 4 “Патрабаванні да атаплення, вентыляцыі і кандыцыянавання”;

– глава 5 “Патрабаванні бяспекі пры эксплуатацыі самаходных лесагаспадарчых машын (трактароў), лесатранспартных сродкаў, абсталявання для лесанарыхтоўкі, сродкаў механізацыі, дрэваапрацоўчага абсталявання, інструмента, дапаможных прыстасаванняў, тары”;

– глава 6 “Патрабаванні да прымянення канатных установак”.

Раздзел ІІ “Патрабаванні пры вядзенні лясной гаспадаркі”:

– глава 7 “Патрабаванні пры правядзенні лесагаспадарчых работ”;

– глава 8 “Патрабаванні пры правядзенні лесаўпарадкавальных работ, работ па адвядзенню і таксацыі лесасек”;

– глава 9 “Патрабаванні да правядзення работ па нарыхтоўцы жывіцы”;

– глава 10 “Патрабаванні па падрыхтоўцы лесасекі да правядзення лесасечных работ”;

– глава 11 “Патрабаванні да правядзення высечак (валкі) лесу (дрэваў);

– глава 12 “Патрабаванні пры правядзенні тралявання драўніны”;

– глава 13 “Патрабаванні пры правядзенні работ па ачыстцы дрэваў ад сучкоў і лесасек ад высякальных рэшткаў;

– глава 14 “Патрабаванні пры распілоўцы хлыстоў;

– глава 15 “Патрабаванні пры сартаванні і расколванні круглых лесаматэрыялаў, сартыментаў;

– глава 16 “Патрабаванні да складзіравання лесаматэрыялаў і піламатэрыялаў”;

– глава 17 “Патрабаванні да пагрузкі і разгрузкі лесаматэрыялаў і піламатэрыялаў”.

Раздзел ІІІ “Патрабаванні пры апрацоўцы драўніны і вытворчасці вырабаў з дрэва”:

– глава 18 “Патрабаванні да сартавання і пакетавання піламатэрыялаў”;

– глава 19 “Патрабаванні да антысэптычнай апрацоўкі піламатэрыялаў”;

– глава 20 “Патрабаванні да фарміравання сушыльных пакетаў”;

– глава 21 “Патрабаванні да камернай сушкі піламатэрыялаў”;

– глава 22 “Патрабаванні пры вырабу трэсак з драўніны”;

– глава 23 “Патрабаванні да вырабу дэталяў з драўняных матэрыялаў”;

– глава 24 “Патрабаванні апрацоўкі дэталяў і вырабаў з дрэва”;

– глава 25 “Патрабаванні да вырабу драўнянастружкавых пліт”;

– глава 26 “Патрабаванні да вырабу драўнянавалакністых пліт”;

– глава 27 “Патрабаванні да вырабу паркета і паркетных дошак”;

– глава 28 “Патрабаваніі да вырабу фанеры”;

– глава 29 “Патрабаванні да вырабу струганай шпоны”;

– глава 30 “Патрабаванні да вырабу драўняных слаістых пластыкаў і смолаў”;

– глава 31 “Патрабаванні да вырабу запалак”.

Дадатак 1 “Пералік работ, які звязаны з вядзеннем лясной гаспадаркі, апрацоўкай драўніны і вытворчасцю вырабаў з дрэва”, на выкананне якіх неабходна выдаваць нарад-допуск”.

Дадатак 2 “Спосабы вядзення ручной валкі”.

Абавязковае выкананне патрабаванняў аховы працы пры вядзенні лясной гаспадаркі, апрацоўцы драўніны і вытворчасці вырабаў з дрэва забяспечвае неабходныя стасункі па прадухіленню вытворчага траўматызму і прафесійных захворванняў.

## ЛІТАРАТУРА

1. Безопасность жизнедеятельности человека. Практикум / А.В. Домненкова [и др.]. – Минск: БГТУ, 2023. – 252 с.

2. Босак, В.М. Асаблівасці назапашвання радыенуклідаў у лясных экасістэмах / В.М. Босак, Т.У. Сачыўка, А.У. Дамнянкова // Лесное хозяйство. – Минск: БГТУ, 2024. – С. 60–62.

3. Босак, В.Н. Анализ результатов аттестации рабочих мест по условиям труда рабочих основных профессий на рубках леса / В.Н. Босак, И.Т. Ермак, А.К. Гармаза // Технология органических веществ. – Минск: БГТУ, 2016. – С. 9.

4. Босак, В.Н. Безопасность труда и пожарная безопасность в лесном хозяйстве / В.Н. Босак. – Минск: РИПО, 2013. – 232 с.

5. Босак, В.Н. Особенности проведения йодной профилактики / В.Н. Босак, Т.В. Сачивко // Технология органических веществ. – Минск: БГТУ, 2018. – С. 25.

6. Босак, В.Н. Радиационная безопасность в лесном хозяйстве / В.Н. Босак, Л.А. Веремейчик. – Минск: РИПО, 2018. – 277 с.

7. Домненков, В.А. Рубки леса в зоне последующего отселения (15–40 Ки/км$^2$) / В.А. Домненков, Е.В. Сермакшева, А.В. Домненкова // Лесное и охотничье хозяйство. – 2013. – № 11. – С. 19–25.

8. Домненкова, А.В. Основные закономерности распределения радионуклидов в лесных экосистемах / А.В. Домненкова, В.Н. Босак, Т.В. Сачивко // Инновационные решения в технологиях и механизации сельскохозяйственного производства. – Горки: БГСХА, 2024. – Вып. 9. – С. 39–42.

9. Домненкова, А.В. Радиационная обстановка на объектах и рабочих местах лесного хозяйства / А.В. Домненкова, Л.Н. Карбанович, В.Н. Босак // Технология органических веществ. – Минск: БГТУ, 2019. – С. 44.

10. Кондраль, А.Е. Организация и проведение работ с повышенной опасностью / А.Е. Кондраль, В.Н. Босак // Главный агроном. – 2024. – №. 9. – С. 56–59.

11. Кондраль, А.Е. Производственный контроль охраны труда на предприятиях АПК / А.Е. Кондраль, В.Н. Босак, М.В. Цайц // Инновационные решения в технологиях и механизации сельскохозяйственного производства. – Горки, БГСХА, 2025.

12. Охрана труда в лесном хозяйстве и производстве изделий из древесины: ОСБР 1-59 01 08-2014 / О.А. Олекс, С.П. Кудравец, В.Н. Босак, С.Н. Пищов. – Минск, 2014. – 25 с.

13. Парфенюк, И.А. Факторы риска в лесохозяйственной промышленности / И.А. Парфенюк, В.В. Демидчик, В.В. Пузевич // Обеспечение безопасности жизнедеятельности на современном этапе развития общества. – Горки: БГСХА, 2022. – С. 82–83.

14. Поставка древесного топлива с соблюдением норм и правил обеспечения радиационной безопасности / А.В. Домненкова [и др.] // Технология органических веществ. – Минск: БГТУ, 2022. – С. 83–85.

15. Прогноз изменения радиационной обстановки на территории Великонемковского лесничества ГСЛХУ «Ветковский спецлесхоз» / А.В. Домненкова [и др.] // Лесное хозяйство. – Минск: БГТУ, 2024. – С. 101–104.

16. Пути снижения травматизма при валке деревьев / А.Е. Кондраль [и др.] // Инновационные решения в технологиях и механизации сельскохозяйственного производства. – Горки: БГСХА, 2020. – Вып. 5. – С. 98–102.

17. Распределение территории лесного фонда Министерства лесного хозяйства Республики Беларусь по зонам радиоактивного загрязнения / А.В. Домненкова [и др.] // Технология органических веществ. – Минск: БГТУ, 2023. – С. 60–62.

18. Степанович, Д.А. Обеспечение безопасности при проведении лесосечных работ / Д.А. Степанович, Я.В. Харитонова, Н.В. Клочкова

// Обеспечение безопасности жизнедеятельности на современном этапе развития общества. – Горки: БГСХА, 2023. – С. 250–253.